Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!



# ГРОДЗЕНСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, ПРАФКОМАЎ, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

№ 14 (138) Чацвер, 3 мая 1990 года

## Раяцца камуністы

Адбыўся агульнауніверсітэцкі адкрыты партыйны сход з наступным парадкам дня:

1. Вынікі абмеркавання праекта Платформы ЦК КПСС да XXVIII з'езда.

дакл. **Чарапіца В. М.**

2. Аб праекце Статута КПСС.

дакл. **Жарскі М. В.**

3. Аб тэрмінах будучых справаздач і выбараў ва універсітэце і аб парадку выбрання дэлегатаў на партыйныя канферэнцыі і з'езд.

дакл. **Пчэльнік В. К.**

4. Выбары падліковай камісіі.

5. Выбранне дэлегатаў на абласную, гарадскую і раённую партыйныя канферэнцыі.

6. Вылучэнне кандыдатаў у дэлегаты на XXVIII з'езд КПСС па Ленінскай выбарчай акрузе № 2.

## ПАСТАНОВЫ

**партыйнага сходу ГрДУ імя Я. Купалы**

**Праслухаўшы і абмеркаваўшы пытанне «Вынікі абмеркавання праекта Платформы ЦК КПСС да XXVIII з'езда партыі» (дакладчык В. М. Чарапіца) партыйны сход пастанаўляе:**

1. Лічыць, што праект Платформы ЦК уяўляе сабой крок уперад у развіцці ўнутрыпартыйнай дэмакратыі, больш дакладнае вызначэнне арыентыраў руху.

2. Выказваючы ў цэлым станоўчыя адносіны да праекта, адзначаючы яго кансалідуючае ўздзеянне на партыю і грамадства, камуністы ГрДУ адзначаюць элементы дэкларатыўнасці і недагаворанасці па самых вострых палітычных, эканамічных і іншых пытаннях.

3. Адзначыць мэтазгоднасць публікацыі ў бліжэйшы час прамежкавага або другога варыянту праекта Платформы ЦК з улікам унесеных камуністамі карэктыў.

4. Нават могуць быць выкарыстаны і іншыя прапановы, якія былі выказаны раней на сходах.

**ПАРТЫЙНЫ СХОД, АБМЕРКАВАЎШЫ ПРАЕКТ СТАТУТА КПСС, ПАСТАНАЎЛЯЕ:**

1. Адобрыць у цэлым праект Статута КПСС, як адпавядаючы ідэйнай аснове і сацыялістычнаму ідэалу партыі.

2. Партыйнаму камітэту абагульніць выказаныя камуністамі прапановы аб унясенні дапаўненняў і змен у праект Статута КПСС і накіраваць іх у ЦК КПСС.

3. Прапановы партыйнай арганізацыі па ўнясенню дапаўненняў і змен у праект Статута КПСС апублікаваць у шматтыражнай газеце «Гродзенскі універсітэт».

**У выніку тайнага галасавання дэлегатамі на 22-ю абласную партыйную канферэнцыю г. Гродна выбраны наступныя таварышы:**

1. Бадакоў А. В.
2. Пчэльнік У. К.

**Дэлегатамі на 30-ю гарадскую партыйную канферэнцыю г. Гродна выбраны наступныя таварышы:**

1. Гайдашаў Г. Е.
2. Гушчын У. В.
3. Іванчук Б. М.
4. Кірвель Ч. С.
5. Казейка М. І.
6. Піульскі Я. В.
7. Чарапіца В. М.

**Дэлегатамі на VII-ю раённую партыйную канферэнцыю Ленінскага раёна г. Гродна выбраны наступныя таварышы:**

1. Аніська П. Я.
2. Забялендзік С. Ф.
3. Ягорычаў У. Я.
4. Нядзелька У. А.
5. Сокал С. Ф.
6. Станкевіч В. С.
7. Шыханцоў Г. Г.
8. Ягоўдзік К. П.

У выніку тайнага галасавання кандыдатамі ў дэлегаты на XXVIII з'езд КПСС па Ленінскай выбарчай акрузе № 2 г. Гродна не вылучаны ніхто.

## НЕ БУДЗЕМ АБЫЯКАВЫМІ!

Дарагія сябры!

Праваслаўнай царкве вернута Барысаглебаўская (Каложская) царква. Гэта — наша гісторыя, наша памяць.
Царква заснаваная ў 12 ст. і наш доўг перад памяццю продкаў — зберагчы яе і захаваць для нашчадкаў. Зараз многія памятнікі гісторыі і культуры вярнулі іх сапраўдным гаспадарам, таму ў епархіі не хапае сродкаў для хуткага аднаўлення царквы.

У дні Светлай сядміцы гэтага года мы звяртаемся да Вас з пакорнай просьбаю. Усіх, каму дарагая памяць аб продках, аб веры, якой служылі яны надзеяй і апорай, праваслаўных, католікаў, хрысціян другіх канфесій, атэістаў прашу дапамагчы аднаўленню Барысаглебаўскай царквы працай сваёй і сэрцам, рукамі ў дні і гадзіны, калі гэта магчыма, і грашыма, па меры сваіх дастаткаў. Няхай ахвяра гэта не будзе адначасовай, дапамажыце сабе стаць вартымі гэтай зямлі і сягоння, і заўтра, і ва векі вякоў.

За спраўкамі і з прапановамі аб формах удзелу (ахвяраванні, работы па аднаўленню) звяртацца да дацэнта кафедры радыёфізікі і электронікі Барыхіна Барыса Аляксеевіча (р. т. 33-05-36, д. т. 2-63-04) або да настаяцеля Барысаглебаўскай (Каложскай) царквы айцу Аляксандру ў суседні з універсітэтам Пакроўскі сабор.

**Б. БАРЫХІН,**

**С. СЯЛЬВЕРСТАВА**, старшыня універсітэцкага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры, **С. ГАБРУСЕВІЧ**, старшыня

## «ТЫДЗЕНЬ НАВУКІ — 90

Завершаны «Тыдзень навукі—90» ва універсітэце, прысвечаны 120-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна.

Факультэты і агульнафакультэцкія кафедры праводзілі навуковыя, навукова-практычныя канферэнцыі выкладчыкаў і студэнтаў па адпаведных праграмах. Прагучалі наступныя пленарныя даклады:

«Эўрыстычныя метады ў навуковай рабоце» (дакладчык Г. А. Зорын, заг. кафедры крымінальнага права, працэсу і крыміналістыкі, дацэнт).

«Актуальныя праблемы гісторыі Беларусі» (С. В. Палуцкая, дацэнт кафедры гісторыі БССР).

Вось што сказаў **В. А. Пранько**, асістэнт кафедры матэматычнага аналізу, аб правядзенні «Тыдня навукі-90» на матэматычным факультэце:

— Працавалі ў чатырох секцыях. Што было характэрна для гэтага мерапрыемства, гэта сумесная праца студэнтаў і выкладчыкаў. Разам рыхтаваліся да ўдзелу ў «Тыдні навукі». Студэнт рабіў даклад, навуковы кіраўнік яго аналізаваў, абагульняў. Выступалі з цікавымі навуковымі дакладамі як студэнты, так і выкладчыкі. Дарэчы, прагучала 40 дакладаў.

Адзначана найбольш выніковая праца наступных студэнтаў: Ю. Гняздоўскага, І. Дайлідка, С. Соўца, А. Швед — 5 курс, Ж. Юхневіч, Д. Манкелевіч — 3 курс, Т. Прыбылоўскай — 2 курс.

Адметна тое, што актыўны ўдзел у «Тыдні навукі—90» прынялі першакурснікі факультэта. Яны ўважліва слухалі даклады, а разам з тым знаёміліся з напрамкамі навуковай работы выкладчыкаў, студэнтаў-старшакурснікаў. Адным словам, на добрым прыкладзе бачылі, якая ў іх наперадзе цікавая самастойная навуковая работа.

І ў заключэнні хацелася б сказаць некалькі слоў аб тым, што характэрна для навуковых дакладаў лепшых студэнтаў, прозвішчы якіх толькі што назваў. Звяртаюць увагу актуальнасць тэмы даследаванняў, добрае валоданне сучасным матэматычным апаратам, атрыманы шэраг новых навуковых вынікаў.

**Л. СЯРГЕЕВА.**

## НА ЗЛОБУ ДНЯ

У сувязі з неспрыяльнай экалагічнай абстаноўкай у нашай рэспубліцы і неабходнасцю актывізацыі асветніцкай і прафілактычнай работы ва універсітэце праведзены цыкл лекцый па наступнай тэматыцы:

Ці можна ўратавацца ад раку?

Сучасныя дасягненні ў дыягностыцы, лячэнні і прафілактыцы анкалагічных захворванняў.

Якія хваробы сярод студэнтаў найбольш распаўсюджаны? Шляхі зніжэння захворванняў.

Наперадзе, у маі, наступныя лекцыі:

Хваробы XX-га стагоддзя, прагнозы і прафілактыка.

Сучасны стан айчыннай хірургіі.

**З лекцыямі выступае прафесар-анколаг М. Г. БУРНЕЙКА.**

*Да ўвагі студэнтаў*

## Стипендии будут повышены

В правительстве страны рассмотрен и одобрен проект постановления Совета Министров СССР, ВЦСПС и ЦК ВЛКСМ «О дополнительных мерах по улучшению материально-бытовых условий студентов высших и учащихся средних специальных учебных заведений». Этот документ комментирует первый заместитель заведующего Отделом культуры и народного образования Совета Министров СССР А. И. Владимиров.

В настоящее время материальную помощь учащаяся молодежь получает в основном через систему стипендиального обеспечения, главным источником которой являются бюджетные ассигнования. И только 8,2 процента студентов и учащихся получают стипендии за счет средств предприятий. Действующие размеры основной стипендии (40 рублей в месяц в вузе и 30 рублей в техникуме) были установлены в 1971 году, и после этого практически не пересматривались. Изменялись только размеры надбавок за успеваемость. Как известно, за отличную учёбу размер стипендии увеличивается на 50 и за хорошую — на 25 процентов.

Два десятилетия назад минимальный размер стипендии студентов составлял примерно треть от средней заработной платы рабочих и служащих. Сегодня это соотношение снизилось до 17 процентов. Кроме того, только 76 процентов студентов и учащихся дневных отделений вузов и техникумов обеспечены стипендией и практически каждый четвертый получает ее в минимальном размере, а более миллиона успевающих студентов и учащихся не имеют постоянной материальной поддержки государства.

Вот почему жизнь настоятельно потребовала ускорить создание для учащейся молодежи необходимых условий. Согласно принятому решению уже щих студентов вузов и учащихся техникумов стипендией, а с сентября 1990 года увеличить наполовину ее базовый уровень. При этом необходимо отметить, что существующая дифференциация стипендий в зависимости от курса и специальности отменяется. Вводится ее единый размер: в вузах — 60 рублей в месяц и в техникумах —45 рублей.

В то же время сохраняются установленные ранее, более высокие стипендии студентам вузов, обучающимся по математическим специальностям, специальностям атомной энергетики, а также в отдельных вузах (таких, как Московский государственный технический университет им. Н. Э. Баумана, Обнинский институт атомной энергетики и ряде других). Сохраняются действующие размеры стипендии для детей-сирот, Героев Советского Союза и Героев Социалистического Труда.

Что даст повышение стипендии учащейся молодежи? Средние размеры стипендии в вузах возрастут с 61 рубля до 74 рублей в месяц, в техникумах — с 43 до 56 рублей.

Кроме того, проектом предусматривается развитие новых форм материального обеспечения студентов и учащихся. В частности, признано целесообразным создавать в высших и средних специальных учебных заведениях фонды социальной помощи остронуждающимся студентам и учащимся для оплаты льготного питания, оказания материальной помощи тем, кто имеет детей. Этот фонд образуется за счет экономии стипендиального фонда учебного заведения и средств, полученных им из других (внебюджетных) источников.

В целях повышения жизненного уровня семей студентов и учащихся, создания более благоприятных условий для сочетания учебы и воспитания и средних специальных учебных заведениях с отрывом от производства, сохраняется право на получение стипендии в полном размере, а также пособия в период предоставляемого им частично оплачиваемого отпуска по уходу за ребенком.

Сберегательный банк СССР будет теперь предоставлять студентам высших учебных заведений, обучающимся с отрывом от производства, кредит в размере до 2000 рублей на срок до 10 лет с погашением начиная с первого года работы после окончания учебного заведения и выплатой 3 процентов годовых. Эти кредиты могут быть предоставлены семейным студентам, начиная с III курса обучения по ходатайству ректората и общественных организаций.

Конечно, многих волнует вопрос: где будут изысканы ресурсы для повышения стипендий? Ведь на эти цели требуется в год около 1,6 миллиарда рублей. Сумма, как видите, немалая.

В соответствии с поручением Совета Министров СССР Госплан СССР, Минфин СССР и Госкомтруд СССР определили источники финансирования дополнительных затрат. Ими предусматривается, что покрытие указанных расходов будет осуществлено министерствами и ведомствами, имеющими учебные заведения; предприятиями и организациями за счет расширения договорных форм подготовки специалистов; за счет экономии средств в результате намечаемых гособразованием мер по совершенствованию деятельности высших и средних специальных учебных заведений и бюджетных ассигнований. Госбюджетные средства уже учтены в расчетах расходов государства на централизованные мероприятия по повышению уровня жизни народа в тринадцатой пятилетке, и дополнительных ассигнований не потребуется.

*Нашы інтэрв ´ю*

# ЧАКАЕ АПЕРАТЫЎНЫ АТРАД

Сістэма заахвочвальных мер для студэнтаў — членаў аператыўнага атрада ГрДУ імя Я. Купалы была прынята 25 сакавіка 1990 года на сходзе камсамольскага актыву і падтрымана рэктарам. З пытаннямі аб дзейнасці атрада мы звярнуліся да яго камандзіра **Сяргея Губіна**, студэнта матэматычнага факультэта.

— Па-першае, хочацца адзначыць, што такі дакумент прыняты вельмі своечасова. Для студэнтаў не лішняя надбаўка да стыпендыі, прычым яна не з фонду факультэта, а з рэктарскага фонду. Яшчэ адзін немалаважны момант — вызваленне членаў атрада ад сельскагаспадарчых работ у верасні. Думаю, што сістэма заахвочвальных мер прыцягне такім чынам людзей да працы ў аператыўным атрадзе.

**— Ці сустракаецца атрад з цяжкасцямі ў сваёй рабоце!**

— Вельмі кепска наладжана справа з транспартам. Рэктар, вядома, паабяцаў нам машыну раз у месяц абавязкова — для дзяжурства. У нас ва універсітэце ёсць маленькі аўтобус — манеўраная машына, таннае паліва, зручны фургон, дзе могуць змясціцца некалькі чалавек. Добра было б атрымаць гэты аўтобус нашаму атраду...

**— Аператыўны атрад існуе, дзейнічае, а , відаць, многія студэнты мала ведаюць аб яго рабоце.**

— Пачнем з таго, што нас турбуе больш астатняе. Колькасць членаў атрада — 36 чалавек, а з універсітэта ў яго складзе — толькі 11(!). Асабліва хочацца адзначыць нашых дзяўчат. Гэта 3 студэнткі з факультэта првазнаўства Анжэла Марозік (2 курс), Таццяна Міроненка (2 курс) і Людміла Патрэйка (1 курс). Ведаеце, такое пачуццё, што ніхто з нас зараз не ўсведамляе сур'ёзна становішча са злачыннасцю. Пакуль чалавек не сутыкнецца з бядою, да той пары ён лічыць, што ўвогуле ўсё добра складаецца.

Па-другое, немагчыма не звярнуць свой позірк да факультэта правазнаўства. Набор на факультэт склаў 125 чалавек. Гледзячы на лічбу, не цяжка зразумець, што такі факультэт можа мець свой атрад. І ўвогуле, здаецца, набор трэба праводзіць менавіта на факультэт правазнаўства іншым чынам, па прафесійным якасцям. Я, як камандзір аператыўнага атраду, пажадаў бы, каб хлопцы і дзяўчаты — студэнты— правазнаўцы — на працягу хаця б аднаго з 2 гадоў вучобы (асабліва тыя, хто паступае па накіраваннях ва універсітэт), удзельнічалі ў рабоце атрада.

І яшчэ хацелася б сказаць вялікае дзякуй аддзелу міліцыі за тое, што яны даверылі нашаму атраду карыстацца новымі радыёстанцыямі. Раней у нас былі рацыі, але па іх мы не маглі ў неабходным выпадку звярнуцца ў міліцыю, у «хуткую дапамогу», трымалі сувязь адзін з другім.

**— А дзе даводзіцца часцей несці дзяжурствы! Ці бываюць жорсткія сутыкненні з тымі, хто парушае парадак!**

— Наш аператыўны атрад мае самы «гарачы» раён у сваім падначаленні. Судзіце самі: ці лёгкае дзяжурства можа быць, калі такія кропкі знаходзяцца ў раёне: кафэ (вул. Свердлава, Віленская, Маставая), Дом афіцэраў, Палац тэкстыльшчыкаў, драматычны тэатр, сярэднія школы (№ 1, 8, 10), універсітэт, інтэрнаты (сельгасінстытута, 41-га вучылішча), некалькі рэстаранаў. Нам прыходзіцца складаць карты, маршруты.

Часта наведваем дыскатэкі, па некалькі разоў — адны і тыя ж падвальныя памяшканні, месцы, дзе пракладзены цеплатрасы. Асабліва тут збіраюцца падлеткі, займаюцца зусім не дзіцячымі справамі. А ім не больш 12—15 гадоў(!) — жудасна становіцца, калі бачыш такое. А яшчэ горш, калі прыходзіцца (а ў апошні час усе часцей і часцей) прыязджаць на сямейныя скандалы. Цяжэй усяго працаваць з падлеткамі. Але, падкрэслю, нам трэба працаваць і пастаянна займацца імі.

**— Так, нялёгка даводзіцца членам атрада. Але можна гаварыць і аб выніках работы!**

— Не ведаю, ці можна лічыць гэта нашай заслугай, але ўсё ж скажу, што ў Ленінскім раёне г. Гродна за першыя тры месяцы цяперашняга года ў параўнанні з мінулым злачыннасць паменшылася. Цяпер мы ўсімі сіламі стараемся навесці парадак у інтэрнаце на БЛК універсітэта. Многія з парушальнікаў правіл пражывання ў інтэрнаце атрымалі строгія вымовы, такім студэнтам рэкамендавана пакінуць інтэрнат.

Вядома, спраў у нас шмат. Патрэбны атраду моцныя духам, смелыя, праўдзівыя людзі, тыя, хто хоча ўнесці асабісты ўклад у барацьбу са злачыннасцю, умацаванне правапарадку.

**Гутарку вяла Н. БЕДЗЬ.**

## СІСТЭМА ЗААХВОЧВАЛЬНЫХ МЕР ДЛЯ СТУДЭНТАЎ — ЧЛЕНАЎ АПЕРАТРАДА ГрДУ

1. Удзельнікам аператыўнага атрада налічваюцца балы, якія ўлічваюцца пры размеркаванні (1 год —3 балы, 2 гады — плюс 4 балы, 3 і больш — плюс 5 балаў).

2. Членам аператыўнага атрада налічваецца надбаўка да стыпендыі не менш 20 руб. у месяц (па прадстаўленню штаба аператраду).

3. Штаб аператыўнага атрада можа прапаноўваць адміністрацыі універсітэта прызначэнні стыпендый лепшым членам аператрада, не атрымліваючым яе.

4. Лепшым членам аператыўнага атрада, праявіўшым сябе ў рабоце з цяжкімі падлеткамі, залічваць летнюю педагагічную практыку.

5. Члены аператрада вызваляюцца ад восеньскіх сельскагаспадарчых работ пры неабходнасці іх працы ў атрадзе (спіс прадстаўляецца штабам атрада). Колькасць дзяжурств у верасні не менш дванаццаці.

6. Члены аператыўнага атрада, якія займаюцца ў секцыях каратэ, УШУ, рукапашнага бою і г. д., пераводзяцца на індывідуальныя планы навучання па фізвыхаванню.

7. Студэнты, якія займаюцца на факультэце правазнаўства, паступіўшыя па накіраваннях ад праваахоўных органаў рэспублікі, павінны на працягу першага ці другога года вучобы ва універсітэце ўдзельнічаць у рабоце аператыўнага атрада.

8. Студэнты — члены аператыўнага атрада, якія пражываюць у інтэрнаце, маюць права бесперашкаджальнага праходу ў інтэрнат у любы час сутак. Студэнты — члены аператыўнага атрада, якія не пражываюць у інтэрнаце, маюць права бесперашкаджальнага праходу ў інтэрнат у любы час толькі з пісьмовага дазволу камандзіра атрада.

9. Камітэт камсамола, прафкомы універсітэта заахвочваюць лепшых членаў аператрада грашовымі прэміямі, каштоўнымі падарункамі, льготнымі пуцёўкамі.

## Кадр з жыцця факультэта



*Студэнты чацвёртага курса 3-й групы фізічнага факультэта Аляксандра Дарына і Дзмітрый Бароўскі на занятках у лабараторыі атамнай фізікі.*

*Газета выступіла. Што зроблена?*

# СПРАВА — АГУЛЬНАЯ

**На пытанні студэнтаў і супрацоўнікаў універсітэта, якія былі змешчаны ў нумарах газеты № 9 і № 12 за 1990 год, аб стане спраў на біяфаку і ва універсітэцкіх інтэрнатах, адказвае прарэктар па АГР Я. А. САЎЧУК.**

Пытанні ўтрымання будынкаў вучэбных карпусоў і інтэрнатаў універсітэта згодна з санітарнымі патрабаваннямі, падтрымка парадку і высокай культуры ў іх непакояць нас усіх: рэктарат, студэнцкія калектывы, састаў выкладчыкаў. У значнай ступені гэта датычыцца работнікаў адміністрацыйна-гаспадарчай часці.

Неабходна адзначыць, што з боку работнікаў гаспадарчай часці яшчэ маюць месца запаволенасць, несвоечасовае прыняцце мер па паступаючых скаргах, выкананню заявак па розных цякучых пытаннях, як, напрыклад, правядзенне рамонтаў, забеспячэнне мэбляй і іншым інвентаром памяшканняў, аудыторый, у вырашэнні іншых бытавых пытанняў. Мае месца і шэраг іншых недахопаў у нашай рабоце.

Аднак шэраг сур ´ёзных нараканняў ёсць і на многіх студэнтаў, якія жывуць у інтэрнатах № 2 і № 3, якія далёка не заўсёды трымаюцца элементарных норм устаноўленага парадку ў інтэрнатах. Праз вокны пакояў пастаянна выкідаецца рознае смецце. Асабліва гэта мае месца ў інтэрнаце № 3, што на БЛК. Зараз тэрыторыя вакол гэтага інтэрната штодзённа прыбіраецца новым дворнікам. Але ж не здарма кажуць: «Чыста не там, дзе прыбіраюць, а там, дзе не насмечваюць».

Унутры памяшканняў студэнты таксама не падтрымліваюць патрэбны парадак. Кідаюць смецце і кураць у забароненых месцах. Неабходна звярнуць увагу на больш беражлівыя адносіны студэнтаў да грамадскай маёмасці і асабліва да мэблі. У гэтым годзе забеспячэння мэбляй па фондавых пастаўках амаль не будзе. Міністэрства народнай адукацыі рэкамендавала паменшыць спісанне мэблі, рамантаваць старую.

З улікам вышэйсказанага было б вельмі добра, каб дэканы, выкладчыкі наведвалі студэнцкія інтэрнаты, цікавіліся жыццём і бытам студэнтаў і прымалі ўдзел у паляпшэнні парадку і дысцыпліны сярод студэнтаў, якія жывуць у інтэрнаце.

Толькі агульнымі намаганнямі рэктарата, дэканатаў, выкладчыкаў, студэнцкіх калектываў, работнікаў адміністрацыйна-гаспадарчай часці можна дабіцца поспехаў у паляпшэнні быту студэнтаў, парадку ў інтэрнатах, аудыторыях і іншых памяшканнях універсітэта.

Праблемы інтэрната ўжо разглядаліся на старонках газеты «Гродзенскі універсітэт», і там справядліва былі пастаўлены пытанні ў адрас гаспадарчай службы, выкладчыцкага і студэнцкіх калектываў. З улікам пастаўленых пытанняў у нашай універсітэцкай газеце (№ 9 і № 12 г.г.) аб стане спраў у інтэрнатах і новым, толькі пабудаваным корпусе біяфака чытача цікавяць канкрэтныя адказы.

Што ж плануецца здзейсніць у летне-асенні перыяд цякучага года для паляпшэння ўмоў быту студэнтаў, падтрымкі належнага санітарна-гігіенічнага парадку ў студэнцкіх інтэрнатах універсітэта?

1. Правесці капітальны рамонт інтэрнатаў № 3, што на БЛК-3 і № 2, што на вул. Даватара—27. З гэтай мэтай прадугледжана замена ўсяго сантэхнічнага абсталявання ў будынках інтэрнатаў. Па гэтаму пытанню ўжо заключаны дагавор з прадпрыемствам «Белсантэхмантаж». Спецыялісты ўжо зрабілі адпаведныя разлікі, падрыхтавалі рабочыя чарцяжы сантэхнічных вузлоў і дэталяў, перадалі іх на завод сантэхнарыхтовак. Пры замене абсталявання будуць устаноўлены знятыя раней мыйкі, аб якіх неаднаразова пыталі студэнты.

2. Пасля правядзення работ па замене сантэхнічнага абсталявання будзе зроблены рамонт унутры будынкаў інтэрнатаў (пабелка, афарбоўка, прывядзенне ў парадак месц грамадскага карыстання і г. д.). Гэтыя работы будуць здзяйсняцца сіламі прадпрыемства «Гроднапрамбуд», з якім ужо заключаны дагавор.

3. Будзе праведзена частковая замена газавых пліт у інтэрнатах № 2, 3. У цяперашні час у інтэрнаце № 3 ужо пастаўлена 14 новых пліт замест старых.

4. У памяшканнях інтэрнатаў № 2, 3 устаноўлены новыя свяцільні.

5. Набыта ўжо неабходная колькасць дынамікаў для радыё з мэтай замены старых або ўстаноўкі іх там, дзе яны адсутнічаюць.

6. У інтэрнаце № 3 прызначаны новы камендант і заменены некаторыя іншыя тэхнічныя работнікі, што станоўча адбіваецца на парадку ў інтэрнаце і вакол яго.

У бліжэйшы час неабходна стварыць у інтэрнаце № 3 новы студэнцкі савет, які павінен максімум увагі надаць падтрыманню парадку і чысціні ў інтэрнаце.

Ад жыхароў інтэрната № 3, што на БЛК, паступаюць скаргі на недахоп халоднай і гарачай вады. Па гэтаму пытанню мы звярталіся ва ўпраўленне вадаправоднаканалізацыйнай гаспадаркі, якая даследавала вадаправодную сістэму і прычыны недахопу вады. Ад іх прыйшоў пісьмовы адказ, у якім гаворыцца, што дыяметр вадаправоднай трубы, якая вядзе да інтэрната, у цяперашні час не можа забяспечыць усё ўзрастаючую нагрузку па ўжыванню вады, яе трэба неадкладна замяніць на трубу з большым дыяметрам. Але гэта зрабіць вельмі цяжка, т. ш. трэба раскопваць вельмі вялікую тэрыторыю. Аднак гэта пытанне яшчэ будзе вырашацца разам з адпаведнымі інстанцыямі.

Неаднаразова студэнтамі ставілася пытанне аб правядзенні дыскатэк на першым паверсе інтэрната № 3. Праводзіць дыскатэкі ў гэтым памяшканні забаронена, т. ш. гэта супярэчыць правілам пажарнай бяспекі: там няма запаснага выхаду і вокны зроблены так, што іх нельга адчыніцьз-за рашоткі. Па гэтаму пытанню ў нас ёсць прадпісанне аддзелу пажарнай аховы. Пасля рамонту ў гэтай зале будзе размяшчацца бібліятэка.

Мэтазгодна ўспомніць і пра карыстанне службовымі тэлефонамі, якія знаходзяцца ў дзяжурных па інтэрнатах і вучэбных карпусах. Напрыклад, цяжка дазваніцца дзяжурнай у вучэбны корпус № 3, т.ш. адказваюць па тэлефоне іншыя людзі, бо тэлефон падключаны паралельна з іншымі памяшканнямі. У лабараторны корпус на вул. Сацыялістычнай-12, вучэбны корпус № 4, што на вул. Дзяржынскага дазваніцца немагчыма. Прычыны высняюцца. Службовыя тэлефоны дзяжурных у многіх выпадках выкарыстоўваюцца студэнтамі, супрацоўнікамі універсітэта ды і самімі дзяжурнымі для доўгіх асабістых пустаслоўных размоў. Пры гэтым у інтэрнаце № 2 па тэлефоне дзяжурнага вяліся шматлікія размовы па міжгароднай сувязі, што нясе для універсітэта немалыя грашовыя расходы. Тэлефон дзяжурнага павінен выкарыстоўвацца толькі для службовых мэт. Па гэтых пытаннях будзе праведзена службовае разбірацельства. Службовым тэлефонам можна карыстацца ўсім для выкліку ўрача ці хуткай дапамогі, органаў міліцыі, розных аварыйных служб і г. д.

У эксплуатацыі нядаўна зданага корпуса біяфака, што на вул. Даватара 3/1 таксама ёсць недахопы. Корпус, які будавала БУ-2, быў здадзены ў эксплуатацыю са шматлікімі недахопамі, што вызывае нараканні супрацоўнікаў, якія там працуюць, і студэнтаў, якія там вучацца. Пасля здачы корпуса ў эксплуатацыю ўжо некалькі разоў рамантаваўся дах, аднак вада цячэ, як і раней. Па гэтаму пытанню работы будуць праведзены будаўнічым упраўленнем № 2.

Для размяшчэння хімічных рэактываў у «Рамбыттэхніцы» ужо заказана металічнае памяшканне, якое павінна быць зроблена на працягу месяца.

У цяперашні час у вучэбным корпусе няма сантэхніка. Камплектаванне работнікамі гэтай спецыяльнасці мае некаторыя цяжкасці па ўсяму універсітэту ў асноўным па прычыне нізкааплачваемых ставак. Аднак гэта пытанне павінна вырашыцца на працягу бліжэйшага тыдня.

Для ліквідацыі будаўнічых недахопаў заключаны дагавор з работнікамі будаўнічага упраўлення № 2.

Можна было б і далей працягваць апісанне розных недахопаў і праблем, якія перашкаджаюць працаваць і вучыцца супрацоўнікам і студэнтам універсітэта. Аднак пераадолець іх паспяхова мы зможам тады, калі кожны будзе прыкладаць да гэтага сваю ініцыятыву і намаганні.

**АД РЭДАКЦЫІ:**

І ўсё ж, рэдакцыя не задаволена адказам Я. А. Саўчука. Скажам прама — мы чакалі больш канкрэтнай размовы. Адказы на пытанні атрымаліся абагульненымі. Няма канкрэтных тэрмінаў выпраўлення недахопаў, чаго так усе чакалі. Ёсць толькі дагаворы.

Але мяркуем, што на гэтым размова не спыніцца, а студэнты і зацікаўленыя ў гэтым людзі нас падтрымаюць.

*Турысцкімі сцежкамі*

# У ЗДАРОВЫМ ЦЕЛЕ

Кожнай вясной група студэнтаў фізічнага факультэта пад кіраўніцтвам А. М. Баяркіна адпраўляецца ў турыстычны велапрабег.

За апошнія 4 гады мы праехалі па дарогах Беларусі, Літвы, Латвіі, Эстоніі і Калінінградскай вобласці звыш 2,5 тыс. км. Пабывалі ў Вільнюсе, Клайпедзе, Рызе, Ліепаі, Валке, Нідзе, Таліне, Тарту, Калінінградзе, Савецку і іншых гарадах і вёсках.

Наведалі многія славутыя мясціны, створаныя чалавекам і прыродай. Доўга мы будзем памятаць стары замак ля г. Тракая, мноства старажытных храмаў, касцёлаў, канатную дарогу ў г. Сігулда, вядомую Ратушную плошчу ў старым Таліне, бібліятэку Тартускага універсітэта і шмат-шмат іншага. Прыемнае ўражанне пакінула ветлівасць і гасціннасць народаў Прыбалтыкі, акуратныя і раскошныя вёскі ў Літве, чыстыя гарады. Аднак бачылі мы і пакінутыя сёлы Калінінградскай вобласці, пакінуты трактар, на якім буслы зрабілі гняздо, дрэнныя аўтамабільныя дарогі, мора, якое агароджана калючым дротам, тысячы таблічак з надпісам: «Туды нельга», незразумелую гульню ў пагранічную зону...

Але, вядома, на першым месцы ў любым турыстычным паходзе — зносіны з прыродай. І хоць чалавек усё больш і больш наступае на яе, яна дорыць яшчэ нам такія цудоўныя імгненні, здзіўляючы нас сваёй прыгажосцю і гармоніяй, якія застаюцца ў душы доўгія гады.

Прыміце ўдзел у велапрабегу, і вы самі пераканаецеся ў гэтым.

**М. МАСЮКЕВІЧ,**
**студэнт 5 курса фізфака, удзельнік 4-х велапрабегаў.**

# ЛІТАБ'ЯДНАННІ

## «УЗЛЁТ» БДУ імя У. І. Леніна. Кіраўнік — член-карэспандэнт АН БССР А. А. Лойка

**С. АДАМОВІЧ**
***ШОРАХІ***

Ахвярую Анатолю Сысу

Ледзь толькі пагасьне сьвятло у пакоі,
Ледзь толькі пасьпее агмень азалець,—
Зьяўляюцца шорахі шыхтам, як воі,
І ўраз па кутох пачынаюць шумець.

Нахабна ў шуфляды залазяць. Да раньня
На почапках віснуць уніз галавой.
Здаецца, нібыта я чую дыханьне
Іх душаў плюгавых у цемры начной.

Мне золка, як зверу ў лядашчай бярлозе.
Мне шорахі — шпегі жыцьця не даюць.
Сваім шаргаценьнем па жорсткай падлозе
Яны мне вантробы на сьвет дастаюць.

Іх цэры з-за чорных шпалераў сьмяюцца.
Ў старой шыткоўніцы яны грамадой
Між собку шальмуюць мяне, і злуюцца,
Што ўпарта імкнуся я мець супакой.

На кніжных паліцах, дзе столькі паснула
Раманных герояў—багоў, прыгажунь,—
Там шорахі шорхнуць з часоў Вельзевула,
Там месяц глядзіць на іх зь неба, як лунь.

І я ў гэтым кодле не йму паратунку,
Бо толькі пад раньне сьціхае мой боль,
Калі, пакідаючы брудныя шлункі,
Зьнікаюць начніцы праз белую столь.

**М. СКОБЛА**

Прымроіцца — шэрагі шэрыя
па могілках, як па праспекце,
паўзводна
каля Машэрава...
З дарогі сысьці паспейце...

І ўздрыгваюць твары з мармуру:
— Скажыце, якія барбары
абцасамі,
брава,
з пошчакам
лезуць у сны нябожчыкам?

Праз агароджу на могілках
рэха паўзе нямоглае...
Рупар раве хрыпаты:
— Вышлі на Курапаты!..

А выйшлі дзяды сівенькія
з утульнай магільнай ночы,
часта міргаючы вейкамі,
каб не асьлеплі вочы.
Сталі да ўнукаў, родныя,
пад вадамёты ротныя.

Прымроіцца — шэрагі шэрыя
на ўзьлесьсі стаяць кругамі.
Кленчаць дзяды на шэрані
на вётраным тым кургане.

Пасьля па пяску, па каменьні,
не ўстаючы з каленяў,
шукацьмуць да могілкаў сьцежкі,
хукаючы на рукі.
А ў мёртвых іх зрэнках — цэшкі.—
Згубілі
Таксама ўнукі...

**С. ПАЎЛОЎСКІ**

Той позірк зьнік, як птушак клін журботны.
Пайшоў цягнік — апала пазалота
З самотных дрэў.
Цягнік яшчэ звінеў
На ранні холад, ну а мо на слоту.
Дзень паміраў, гарэў,
І шэры краўся змрок,
І аддаляў паволі
Ён ад сябе халодную сустрэчу.
Не правы ў чымсьці
Правы быў у нечым.
Няспешны крок прысьпешваў,
Пазіраў на неба край,
Дзе ў гордай адзіноце
Уздрыгвала бязгучна зорка.

***ЭКСПРОМТ***

У шэрым тумане,
у шэрым сусвеце,
З няяснаю згадкай
аб пройдзеным леце
Блукае Надзея
на цёплае раньне,
нямую сустрэчу,
сьляпое каханьне,
на будучы дотык,
былую завею.
І сэрца ў грудзях
у маіх ледзянее.

**С. ІВАНОЎ**
***ДЭПРЭСІЯ***

Як здані шэрыя праходзяць дні за днямі,
Пустой нікчэмнасцю мільгае мітусня
І неспакой нясе з цяжкімі снамі,
Свінцовую санлівасць цягам дня.

Чаго мне трэба? Я і сам не знаю.
Чаго б хацеў? І тут не адкажу,
Бо зведаў ўсё, завецца што грахамі,
А пазбяганнем — толькі больш грашу.

І долу гнуць усе напластаванні
Рахубай цяжкаю, як гнётам, да зямлі —
На будучыню звялі спадзяванні,
Як кветкі веснавыя адцвілі.

Я знаю, што ўсё навокал — блазнаванне,
Пустымі мроямі жыццё сабе сушу.
Калі б на бога меў хоць спадзяванне,
Укленчыў да яго б: «Ратуй маю душу!..»

**А. ДАБРАВОЛЬСКАЯ**

Себя
самосожженьем
исцеляю.
Сгорает оболочка,
и душа
как глина
пламенем печи
опалена,
закалена,
и больше неподвластна
руке и воле своего творца.

## «НАДНЁМАНСКІЯ ГАЛАСЫ».
### Кіраўнік — асістэнт М. У. Мікуліч



**ЮРЫ КАРЭЙВА**
*СОН*

Ці то дагарае ў паветры сляза,
Ці знічка знікае над кволаю зёлкай,—
Па лёзах травы зноў сцякае раса,
Струменіць крывёю пад промнем на золку...

Як след прынялі: адкацілі іх прэч —
І спім, пад галовы падклаўшы стому.
Нам сніцца не ўзняты над намі меч,
А снім, што мы дома... Мы—дома!

Дзе чысты ад хмараў, блішчыць далягляд,
Дзе ў лузе пад сонцам дурэюць цялушкі,
Ды цешацца жонкі з малых немаўлят,
А тыя старанна ім льюць у пялюшкі.

Там звыкла ля плуга заводзяць дзядзькі
Гамонку аб вечным ды Божым —аб збожжы,
Паважна наўкол шпацыруюць гракі...
І мілы такі той куток, такі гожы!

І ўсё там да ладу: ні спрэчак — ні звад,
Папраўлена збруя, наклёпаны косы...
Ды спім — і не можам вярнуцца назад:
Мы спім... мы крывёю сплываем на росы...

**ЕДРУСЬ МАЗЬКО**

Калі я заблудзіўся ў суквецьці пустаты
І, як вар ´ят, са жмені піў пясок,
глядзелі людзі дзіўна на мяне.
У іх вачох жыў зьдзек.

Калі я заблудзіўся ў суквецьці пустаты,
я Храм убачыў на сваім шляху.
Гарэлі ў версе купалы,
крыжы, бы маякі,
надломленым сьвяцілі душам
І музыка (якая музыка!)
жыла ў ягоным алтары.

Калі я заблудзіўся ў суквецьці пустаты
і Храм убачыў на сваім шляху,
я зразумеў тады:
душа мая сваю тут століць смагу.

**АНДРЭЙ ПЯТКЕВІЧ**

Нібы чорныя начныя жаўрукі,
Ходзяць душы ля зачыненай ракі.
Усьміхаюцца прывіды мне ў твар.
Ваўкалак у гэтым сьвеце гаспадар.

Мёртвай зоркаю ляжыць навокал ноч.
Злы вампір дастане доўгі востры нож.
Кроў ахвяраў у крыніцу пацячэ.
Сьлёзы гронкамі замёрзнуць на шчацэ.

Моўчкі падае самота на далонь.
Апякае цішыня сівую скронь.
Нібы чорныя начныя жаўрукі,
Ходзяць душы ля зачыненай ракі.

**ЭПІГРАМА**
***П. І. М-КА***

І дзень, і ноч чытае Макаёнка,
А Чорнага па костках разбярэ.
Даводзіцца студэнтам вельмі горка—
Тры скуры на экзамене здзярэ.

**ЮРАСЬ ПАЦЮПА**
***ДАРЭШТЫ***

Надыдзе ноч, сляпая, бы натхненне,
не чуючы ні глебы ані ног,
я ціха рушу за бялюткім ценем
І ўбачу: на вадзе няма дарог.

Праз вечнасць, немагчымасць і цярпенне,
каторы год наперадзе нас Бог,
няверныя ж, як чорнае каменне
знікаюць спаміж хваляў на вачох.

А мы ўжо за працяг імкнемся лёгка,
наскрозь, ад лісціка да матылёчка,
І потым ад паветра — да святла,
да цемры, да бязмежнага аб ´ёму,
да чыстай хуткасці ў зямное ўлонне,
рассычаныя сілай, што вяла.

**ЮРЫЙ ГУМЕНЮК**
***СТИЛЬ***

Стиль мышления особый, как засовы
Для того, чтобы не плакал твой аппендикс,
Чтоб на льду качались толстые коровы
И из пепла возрождалась птица Феникс.

Стиль мышления объемный, как аорта,
Зазывающий в театр, как афиша,
Он не приспособленный для порта,
Потому что при разгрузке едет крыша.

Стиль мышления порой неординарен.
Стоит сполоснуть немного спиртом—
И профессор медленно поджарен
На огне, зажженном детским флиртом.

Стиль мышления не связан с агропромом,
Потому что он крыло аэроплана,
Он витает над горой металлолома
И третирует параграфы Госплана.

Стиль мышления не бродит по Европе,
Точно по саванне антилопа;
Мчится он на белом автостопе
И достигнет ясной цели до потопа.

***НА ЗДЫМКУ: «Наднёманскія галасы» у час творчага вечара.***

## Спорт

* * *

У спартыўнай зале універсітэта прайшлі ігры першынства ГрДУ імя Я. Купалы па валейболу сярод мужчынскіх каманд у праграме круглагадзічнай спартакіяды. Усе сустрэчы праходзілі ва ўпартай барацьбе і ніводная з каманд не пазбегла паражэнняў.

Першае месца вызначылася толькі пасля апошняй сустрэчы. Атрымаўшы перамогу ў трэцяй, рашаючай партыі, зборная каманда фізфака заняла першае агульнакаманднае месца. На другім — зборная матфака, на трэцім — каманда філфака. Далей месцы вызначыліся наступным чынам: 4 — гістфак, 5 — факультэт правазнаўства, 6 — біялагічны факультэт.

Хочацца адзначыць зніжэнне вынікаў выступленняў зборных каманд гістфака і факультэта правазнаўства, якія ў мінулым годзе былі на першай і другой ступенях.

* * *

Адбыўся бліц-турнір на першынство ГрДУ па шахматах сярод выкладчыкаў. 1-е месца ўпэўнена заняў малады выкладчык з кафедры рускай мовы А. В. Нікіцевіч, другое — у дацэнта кафедры матэматычнага аналізу К. К. Іскры, трэцяе — у выкладчыка кафедры тэорыі і методыкі фізічнага выхавання А. Б. Скарабагатава.

* * *

20 сакавіка ва ўрочышчы «Пышкі» прайшоў лёгкаатлетычны крос у праграме ўнутрывузаўскай спартакіяды. Спаборніцтвы праходзілі ў два этапы.

Першымі на старт выйшлі філолагі і правазнаўцы. Прадстаўнік факультэта правазнаўства Іван Александровіч паказаў на дыстанцыі ў 3 км час 0.004. які і ў далейшым нікому не ўдалося палепшыць. У выніку ў яго першае месца.

У другой палове дня спаборнічалі астатнія факультэты. Сярод дзяўчат лепшай была Галіна Барук (гістфак). Яе час — 2.57.6. Другі вынік у Вольгі Жаранковай (біяфак, 3.41.5). Трэцяе месца ў прадстаўніцы філфака Наталлі Станкевіч (3.47.4).

У мужчын другое месца заняў студэнт фізфака А. Капюшок (0.42.6). Трэцяе месца ў гісторыка К. Качэргіна (0.55.0).

Камандная перамога ў правазнаўцаў — 454 ачкі. На другім месцы гісторыкі — 414 ачкоў, на трэцім — матэматыкі — 373 ачкі. Далей ідуць фізікі, біёлагі, філолагі, апошнія ў камандным першынстве прадстаўнікі факультэта педагогікі і методыкі пачатковага навучання.

Але не абыйшлося і без цяжкасцей. Адносіны прадстаўнікоў гаспадарчай часці універсітэта да сваіх непасрэдных абавязкаў інакш як безадказнасцю і разгільдзяйствам не назавеш. Чакалі арганізатары кросу машыну, каб забраць спартыўны інвентар, але так і не дачакаліся...

**І. БЕЛАОКІ,**
**старшыня спартыўнага клуба ГрДУ імя Я. Купалы.**

* * *

Паспяхова выступілі на першынстве ВНУ Беларусі па барацьбе дзюдо студэнты універсітэта, заваявалі пяць бронзавых медалёў.

Прызёрамі спаборніцтваў сталі Алена Лапнеўская (вага 61 кг) і Яўгенія Буздаліна (вага 72 кг) — студэнткі філфака; Таццяна Якубовіч (вага вышэй 72 кг) — падрыхтоўчае аддзяленне; Алег Асошнік (вага 60 кг) і Валерый Ванюкевіч (вага 78 кг) — факультэт фізвыхавання. Пятае месца занялі Эдуард Максімовіч (ф-т правазнаўства) і Валерый Макей (ф-т фізвыхавання).

У камандным заліку нашы дзяўчаты занялі трэцяе месца. Вялікі ўклад у гэтым дасягненні старшага выкладчыка кафедры фізвыхавання майстра спорту СССР Івана Эдуардавіча Шарко, які рыхтаваў каманду жанчын.

Мужчынская каманда засталася за рысай прызёраў, заняўшы чацвёртае месца.

**А. СМАЛЯКОЎ.**

Наш адрас: 230023, г. Гродна, вул. Ажэшка, 22, пакой 404, тэл. 44-80-70

Газета выходзіць штотыднёва

Гродзенская абласная ўзбуйненая друкарня вул. Паліграфістаў, 4.

Тыраж 2000 экз. Зак. 4087 АИ-01240

Рэдактар Л. С. ЗАСЕЛЬСКАЯ.